***Жыбуль Віктар Вячаслававіч, вядучы навуковы супрацоўнік Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, кандыдат філалагічных навук***

Віктар ЖЫБУЛЬ

**Маладнякоўцы-юбіляры 2019–2020 гг.**

2019 і 2020 гады надзвычай багатыя на юбілеі ўдзельнікаў літаратурнага аб'яднання "Маладняк", многія з якіх нарадзіліся ў 1900, 1904 або 1905 гг. Ніжэй пададзены пералік прадстаўляе нават далёка не ўсіх маладнякоўцаў-юбіляраў, а толькі тых, якія маюць выдадзеныя кнігі і/або чыя дзейнасць адлюстравана ў манаграфічных артыкулах і энцыклапедычных біяграфічных нататках.

***125 гадоў з дня нараджэння (1894–1895):***

**Сяргейчык Пятро Мікалаевіч** [1894, в. Заполле Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Глускі р-н Магілёўскай вобл. – паміж 1956 і 1964], крытык, публіцыст, аграном.

**Родзевіч Леапольд Іванавіч** [12.6.1895, фальв. Кур'янаўшчына Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Лагойскі р-н Мінскай вобл. – 1938], драматург, празаік, публіцыст, паэт, дзеяч рэвалюцыйнага руху Заходняй Беларусі.

***120 гадоў з дня нараджэння (1899–1900):***

**Ільінскі Мікола** [Мікалай Канстанцінавіч; 21.3.1899, м. Мір Навагрудскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Карэліцкі р-н Гродзенскай вобл. – 1943, Мінск], драматург, празаік, акцёр.

**Гародня Алесь** [сапр. Функ Аляксандр Эраставіч; 20.8(1.9).1899, г. Перм. – 12.9.1944, УзССР, ГУЛАГ], празаік, крытык.

**Бабарэка Адам Антонавіч** [2(14).10.1899, в. Слабада-Кучынка Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Капыльскі р-н Мінскай вобл. – 10.10.1938, п. Княж-Пагост Комі АССР, ГУЛАГ], крытык, празаік, філосаф.

**Ганчарык Міхась** [Міхаіл Мікалаевіч; 12(24).11.1899, в. Кляннік Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Смалявіцкі р-н Мінскай вобл. – 11.4.1986, Мінск], вучоны-біёлаг, пісьменнік.

**Лынькоў Міхась** [Міхаіл Ціханавіч; 18(30).11.1899, в. Зазыбы Віцебскага пав. Віцебскай губ., цяпер Лёзненскі р-н Віцебскай вобл. – 21.9.1975, Мінск], празаік, дзіцячы пісьменнік, крытык, грамадскі дзеяч. Народны пісьменнік Беларусі (1962).

**Траецкі Аляксей** [1900 ці 1905 – 23.9.1937, НКВД], празаік, драматург, паэт.

**Моркаўка Аркадзь Андрэевіч** [14(26).1.1900, в. Зазер'е Мінскага пав. Мінскай губ., цяпер Пухавіцкі р-н Мінскай вобл. – 24.4.1957, Мінск], паэт.

**Каспяровіч Мікола** [Мікалай Іванавіч; 9(22).5.1900, в. Ізабалёва Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Пухавіцкі р-н Мінскай вобл. –

17.12.1937, Новасібірск, НКВД], крытык, літаратуразнавец, краязнавец, лексікограф, мастацтвазнавец.

**Жылка Уладзімір Адамавіч** [27.5.1900, в. Макашы Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Нясвіжскі р-н Мінскай вобл. – 1.3.1933, Уржум Кіраўскай вобл. РСФСР], паэт, перакладчык, крытык.

**Чорны Кузьма** [сапр. Раманоўскі Мікалай Карлавіч, 11(24).6.1900, маёнтак Боркі Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер в. Борка-Бялевічы, Капыльскі р-н Мінскай вобл. – 22.11.1944, Мінск], празаік, драматург, публіцыст.

**Дубоўка Уладзімір Мікалаевіч** [2(15).7.1900 (паводле новых звестак – 1901), в. Агароднікі Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Пастаўскі р-н Віцебскай вобл. – 20.3.1976, Масква], паэт, празаік, перакладчык, крытык.

**Баранавых Сымон** [сапр. Баранаў (Баран) Сымон Якаўлевіч; 1.9.1900, в. Рудакова Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Уздзенскі р-н Мінскай вобл. – 10.11.1942, Калыма, ГУЛАГ], празаік, дзіцячы пісьменнік.

**Семашкевіч Раман Мацвеевіч** [1.10.1900, в. Лебедзева Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл. – 22.12.1937, Бутаўскі палігон, Маскоўская вобл. РСФСР], жывапісец, графік, скульптар.

**Купцэвіч Фелікс Піліпавіч** [21.10.1900, Гродна – 31.3.1938, Мінусінск, ГУЛАГ], крытык, празаік.

**Чарнушэвіч Нічыпар Тодаравіч** [1(14).11.1900, мяст. Капыль Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер горад Мінскай вобл. – 18.2.1967, Мінск], паэт, перакладчык, драматург.

**Сукала Язэп** [Іосіф Пятровіч; 29.11.1900, в. Гулевічы Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Бабруйскі р-н Магілёўскай вобл. – 23.9.1937, Мінск, НКВД], паэт, настаўнік.

***115 гадоў з дня нараджэння (1904 – 1905):***

**Якімовіч Алесь** [Аляксандр Іванавіч; 4(17).1.1904, в. Чурылава Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Уздзенскі р-н Мінскай вобл. – 15.1.1979, Мінск], дзіцячы празаік, перакладчык, паэт.

**Мікола Хведаровіч** [сапр. Чарнушэвіч Мікалай Фёдаравіч; 24.3(6.4). 1904, мяст. Капыль Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер горад Мінскай вобл. – 20.8.1981, Мінск], паэт, празаік, перакладчык.

**Трус Паўлюк** [Павел Адамавіч; 23.4(6.5).1904, в. Нізок Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Уздзенскі р-н Мінскай вобл. – 30.8.1929, Мінск], паэт.

**Дудар Алесь** [сапр. Дайлідовіч Аляксандр Аляксандравіч; 24.12.1904, в. Навасёлкі Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Петрыкаўскі р-н Гомельскай вобл. – 29.10.1937, Мінск, НКВД], паэт, крытык, перакладчык.

**Шукайла Паўлюк** [Павел Захаравіч; 18(31).12.1904, в. Малая Лапеніца Ваўкавыскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Ваўкавыскі р-н

Гродзенскай вобл. – 14.4.1939, Масква, НКВД], паэт, празаік, крытык, кіназнаўца.

**Хадыка Уладзімір Марцінавіч** [21.12.1904 (3.1.1905), в. Цітва Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Пухавіцкі р-н Мінскай вобл. – 1.7.1940, Новасібірская вобл., ГУЛАГ], паэт, перакладчык.

**Плаўнік Ізраіль Яфімавіч (Хаімавіч)** (1905, м. Пасадзец Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Лагойскі р-н Мінскай вобл. – лета 1941, Мінск) – паэт, перакладчык.

**Прыбыткоўскі Уладзіслаў Уладзіслававіч** [1905, Мінск (?) – лета 1941, каля Брэста (?)], паэт, крытык.

**Пальчэўскі Алесь** [Аляксандр Восіпавіч; 3(16).1.1905, в. Прусінава Мінскага пав. Мінскай губ., цяпер Уздзенскі р-н Мінскай вобл. – 26.4.1979, Мінск], празаік, драматург.

**Вечар Алесь** [Аляксандр Сцяпанавіч; 12(25).3.1905, в. Машчыцы Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Слуцкі р-н Мінскай вобл. – 4.4.1985, Мінск], вучоны-біяхімік, паэт.

**Баркоўскі Сцяпан Андрэевіч** [28.3(10.4).1905, Слуцк – 11.6.1966, Мінск], крытык, літаратуразнавец, этнограф.

**Гаўрук Юрка** [Юры Паўлавіч; 23.4(6.5).1905, г. Слуцк Мінскай губ., цяпер Мінскай вобл. – 18.2.1979, Мінск], перакладчык, крытык, паэт.

**Пятрусь Броўка** [Пётр Усцінавіч; 12(25).6.1905, в. Пуцілкавічы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Ушацкі р-н Віцебскай вобл. – 24.3.1980, Мінск], паэт, празаік, дзіцячы пісьменнік, перакладчык, грамадскі дзеяч. Народны паэт БССР (1962).

**Глебка Пятро** [Пётр Фёдаравіч; 23.6(6.7).1905, в. Вялікая Уса Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Уздзенскі р-н Мінскай вобл. – 18.12.1969, Масква], паэт, дзіцячы пісьменнік, перакладчык, драматург, вучоны, грамадскі дзеяч.

**Бобрык Янка** [Іван Іванавіч; 8(21).7.1905, м. Глуск Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер г. п. у Магілёўскай вобл. – 25.8.1942, Ленінград], паэт, кінакрытык.

**Барашка Ілары** [Іларыён Мацвеевіч; 12(25).7.1905, Мінск – 3.6.1968, Масква], празаік, крытык, драматург, перакладчык.

**Дубовік Мікола** [28.7.1905, в. Мурыны Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Капыльскі р-н Мінскай вобл. – 30.6.1928, каля Бабруйска], паэт.

**Казлоўскі Віктар (Вінцэсь) Іванавіч** [24.8(6.9).1905 в. Мрочкі Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Уздзенскі р-н Мінскай вобл. – 24.2.1975, тамсама], паэт, перакладчык.

**Мардвілка Аркадзь Пятровіч** [11(24).8.1905, в. Языль Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Старадарожскі р-н Мінскай вобл. – 27.10.1986, Ташент, УзССР], мовазнавец, перакладчык, празаік, крытык.

**Туміловіч Янка** [Іван Людвігавіч; 6(19).9.1905, в. Сяліба Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Бярэзінскі р-н Мінскай вобл. – 21.1.1938, каля бухты Нагаева пад Уладзівастокам, ГУЛАГ], паэт.

**Падабед Язэп Тодаравіч** [лістапад 1905, в. Ванікоўшчына Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Пухавіцкі р-н Мінскай вобл. – ?], паэт.

**Скрыган Ян** [Іван Аляксеевіч; 3(16).11.1905, в. Труханавічы Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Капыльскі р-н Мінскай вобл. – 18.9.1992, Мінск], празаік, паэт, перакладчык.

***120 гадоў з дня нараджэння (1909 – 1910)***

**Дарожны Сяргей** [сапр. Серада Сяргей Міхайлавіч; 25.2.1909, г. Слонім Гродзенскай губ., цяпер Гродзенскай вобл. – 19.7.1943, Далёкі Усход, ГУЛАГ], паэт, перакладчык.

**Маракоў Валеры Дзмітрыевіч** [14(27).3.1909, в. Акалонія Мінскага пав., цяпер у межах Мінска – 29.10.1937, Мінск], паэт, перакладчык.

**Лужанін Максім** [сапр. Каратай Аляксандр Амвросьевіч; 20.10(2.11).1909, в. Прусы Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Салігорскі р-н Мінскай вобл. – 13.10.2001, Мінск], паэт, празаік, кінадраматург, перакладчык.

**Бандарына Зінаіда Аляксандраўна** [11.10.1909 (паводле іншых звестак 1908 ці 1910), Гродна – 16.4.1959, Мінск], паэтка, празаік, культурная дзяячка.

**Козік Язэп Тодаравіч** [1910, в. Козікі Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл. – пасля 1960, Орша (?)] – паэт, журналіст.

**Півавараў Зяма** [Залман Рувімавіч; 24.5(5.6).1910, м. Касцюковічы Магілёўскай губ., цяпер г. Касцюковічы Магілёўскай вобл. – 29.10.1937, Мінск, НКВД], паэт, перакладчык, тэатральны крытык.

**Астапенка Змітрок** [Дзмітры Емяльянавіч; 10(25).11.1910, в. Калеснікі Мсціслаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Хіславіцкі р-н Смаленскай вобл., па іншых звестках в. Сяргееўка Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Шумяцкі р-н Смаленскай вобл. – кастр. 1944, Карпаты, Славакія], паэт, празаік, перакладчык.

Згадваючы пра “Маладняк” і яго ўдзельнікаў, нельга не абмінуць і яшчэ адзін юбілей – 90-я ўгодкі стварэння нефармальнай літаратурнай суполкі “ТАВІЗ” (“Таварыства аматараў выпіць і закусіць”), што паўстала ў верасні 1930 г. як «пратэст супраць існуючага “Пракруставага ложа”» (Ю. Віцьбіч). У “ТАВІЗ” уваходзілі пераважна былыя маладнякоўцы, у тым ліку прысутныя ў нашым пераліку З. Астапенка, С. Дарожны, А. Дудар, М. Лужанін, В. Маракоў, У. Хадыка.

У Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ), акрамя ўласна фонду Усебеларускага аб’яднання паэтаў і пісьменнікаў “Маладняк” (ф. 225), захоўваюцца асабістыя фонды З.

Астапенкі (ф. 128), А. Бабарэкі (ф. 407), З. Бандарынай (ф. 75), С. Баранавых (ф. 46), І. Барашкі (ф. 28), У. Дубоўкі (ф. 27), М. Каспяровіча (ф. 429), М. Лынькова (ф. 191), Я. Скрыгана (ф. 84), П. Труса (ф. 404), М. Хведаровіча (ф. 267), Н. Чарнушэвіча (ф. 166), К. Чорнага (ф. 52), А. Якімовіча (ф. 63), сямейныя фонды М. Лужаніна і Я. Пфляўмбаўм (ф. 140), А. Пальчэўскага і Т. Цулукідзэ (ф. 50), значныя па аб'ёме карпусы дакументаў П. Броўкі, П. Глебкі, У. Жылкі, В. Казлоўскага, П. Шукайлы і іншых літаратараў. Фонды з'яўляюцца каштоўнымі крыніцамі па даследаванні гісторыі беларускай літаратуры ХХ ст. і карыстаюцца інтарэсам сярод даследчыкаў.

**Літаратура і крыніцы:**

1. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва : даведнік. Вып. I. Паступленні 1960–1992 гг. – Мінск : БелНДІДАС, 1997. – 471 с.

2. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва : даведнік. Вып. 2. Паступленні 1993–2009 гг. – Мінск : Медысонт, 2012. – 352 с.

3. БДАМЛМ. Ф. 66, воп. 1, адз. зах. 1443, арк. 1 адв.

4. БДАМЛМ. Ф. 225, воп. 1, адз. зах. 6.

5. БДАМЛМ. Ф. 394, воп. 1, адз. зах. 53, арк. 3.

6. Беларускія пісьменнікі : біябібліягр. даведнік : у 6 т. – Мінск : БелЭн, 1992 – 1995.

7. Государственный архив Пермского края. Ф. 37, оп. 6, д. 895 (Метрическая книга Петропавловский собор, г. Пермь, 1899 год). Электронный доступ: https://pokolenia.permkrai.ru/records/card/492634 . Дата доступа: 03.02.2020.

8. Жыбуль, В. ТАВІЗ : па слядах легендарнага літаб'яднання / В. Жыбуль // Полымя. – 2017. – № 12. – С. 115–126.

9. Маракоў, Л. Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асветы, грамадскія і культурныя дзеячы Беларусі. 1794–1991 : энцыкл. даведнік : у 3 т. – Мінск: Athenaeum, 2004.

10. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 205, воп. 3, адз. зах. 7938, арк. 11.